*УДК 785.16(4+476)*

*І. А. РАБУШКІНА*

# СУЧАСНЫ ЕЎРАПЕЙСКІ ДЖАЗ (СТРУКТУРА І КЛАСІФІКАЦЫЯ)

*Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў*

*(Паступіў у рэдакцыю 18.06.2007)*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Джаз, які ўяўляе сабой шматгранны феномен культуры XX стагоддзя, у працэсе сваёй эвалюцыі выйшаў за межы Злучаных Штатаў Амерыкі і пранік у Еўропу ў час Першай сусветнай вайны. Узнікненне джаза апісана ў такіх аўтараў, як Б. Уланаў, Л. Фезэр, М. Стэрнс, У. Сарджэнт, В. Конэн, В. Аўчыннікаў, Ю. Мітрапольскі. Шляхі пранікнення джазавага мастацтва ў Еўропу ў выглядзе гістарычных апісанняў прысутнічаюць у працах такіх аўтараў, як Дж. Коліер (ЗША), Ю. Панасье, Ф. Бержэро (Францыя), А. Баташоў (Расія), Д. Падбярэзскі (Беларусь). Паколькі ўплыў джаза на акадэмічную музычную традыцыю адбываўся на працягу ўсяго эвалюцыйнага шляху самога джазавага мастацтва, то гэтае пытанне мела трывалы інтарэс сярод замежных і савецкіх (расійскіх) музыказнаўцаў. Формы сінтэзу джаза і акадэмічнай традыцыі пераважна ў амерыканскай музыцы разглядаў У. Сарджэнт (ЗША), у заходнееўрапейскай музыцы да дадзенай тэматыцы звярталіся А. Адэр, у расійскай – У. Сіманенка, В. Конэн, Я. Аўчыннікаў, У. Озераў, Д. Ухаў. Найбольш поўна пытанне ўплыву джаза на кампазітараў акадэмічнага напрамку (у прыватнасці, ажыццёўлена спроба сістэматызацыі і класіфікацыі працэсаў сутыкнення джаза і акадэмічнай традыцыі) разгледжана ў працы А. Казуравай [1], аднак толькі на прыкладзе творчасці заходніх кампазітараў першай паловы XX стагоддзя. У беларускім музыказнаўстве гэта праблема зусім не разглядалася.

Мэта дадзенай працы – выявіць спецыфіку сучаснага еўрапейскага джаза і прадставіць яго жанрава-стылявую класіфікацыю. У адпаведнасці з пастаўленай мэтай вызначаны шэраг задач: скласці генеалогію сучаснага еўрапейскага джаза; абазначыць яго параметры; разгледзець формы праяўлення працэсу крос-стылявой канвергенцыі і яго спецыфіку (на прыкладзе твораў заходнееўрапейскіх, расійскіх і беларускіх кампазітараў).

Еўрапейскія акадэмічныя кампазітары адкрылі для сябе экзатычнасць архаічнага джаза – «рванага» рытму кэкуока, рэгтайма і загадкавасць блюза (Дэбюсі, Равэль і інш.) – яшчэ ў самым пачатку XX стагоддзя. Джазавым цэнтрам Заходняй Еўропы стаў Парыж, дзе дзякуючы вялікай колькасці гастрольных турнэ амерыканскіх бэндаў (у 1919 г. у Заходняй Еўропе гастраліраваў Original Dixieland Jazz Band) і выканаўцаў была падрыхтавана глеба для еўрапейскага джазавага выканальніцтва. Аднымі з найбольш вядомых музыкантаў 30-х гадоў XX стагоддзя былі Стэфан Грапэлі і Джанга Рэйнхард, скрыпач цыганскага паходжання, у творчасці якога ўжо ў той час намеціўся спецыфічны шлях развіцця еўрапейскага джаза: гэта было змяшэнне нацыянальнай цыганскай музыкі і класічнай джазавай стылістыкі*. Іншымі словамі, музыканты спачатку капіравалі, а потым асімілявалі і інтэрпрэтавалі джаз у сваёй творчасці. Развіццю джаза садзейнічалі таксама джазавы крытык і пісьменнік Юг Панас'е і джазавы прадзюсер Шарль Дэлонэ. У пачатку 40-х гадоў у Еўропу пранік і сучасны джаз, аднак да канца 50-х гадоў мінулага стагоддзя

* Hot Club de France – адзін з першых джазавых клубаў у Еўропе, заснаваны ў 1932 г. па ініцыятыве французскага музычнага крытыка Юга Панас'е, аўтара артыкулаў і кніг аб джазе. У 1934 г. на базе гэтага клуба быў створаны джазавы квінтэт, вядучымі салістамі якога сталі гітарыст Джанга Рэйнхард і скрыпач Стэфан Грапэлі. Акрамя іх у ансамблі ігралі (да 1940 г.): Джозэф Рэйнхард — брат Джанга (гітара), Ражэ Шапю (гітара) і Луі Вала (бас). Роля клуба ў гісторыі джаза вельмі значная. Яго дзейнасць дапамагла адраджэнню амаль забытых традыцыйных джазавых стыляў.

еўрапейцы працягвалі знаходзіцца пад музычнай экспансіяй амерыканскага традыцыйнага і сучаснага джаза (стылі новаарлеанскага, чыкагскага, гарлемскага джаза, Свінга, бібопа, халаднаватага інтэлектуальнага джаза, або кула). Разам з тым гэты час для заходнееўрапейскага джаза хутчэй быў перыядам станаўлення і накаплення творчых сіл для наступнага інтэнсіўнага развіцця. Іншымі словамі, адбылася інтэграцыя джаза ў еўрапейскую мастацкую культуру, і ўзнік новы культурны феномен – еўрапейскі джаз, каля вытокаў якога стаялі Андрэ Адэр, Шарль Дэланэ, Надзя Буланжэ, а потым развівалі Марцыял Салал, Жан Люк Панці, Мішэль Парталь, Мішэль Петручыяні, Энрыка Рава, Адам Макавіч, Кшыштаф Камеда, Альберт Мангельсдорф, Даніэль Юмер, Іоахім Кюн, Хан Бенінк, Джон МакЛафлін.

У Расіі (былым СССР) джаз з'явіўся ў 1920-х гг. Шырокае распаўсюджанне ён атрымаў у 30-я гг., увасобіўшыся ва унікальным феномене – злучэнні жанраў джаза і масавай савецкай песні (творчасць І. Дунаеўскага, Л. Уцёсава). У 50-я гг. наступае час «перагляду» цэннасных арыенціраў, за якім у 60–70-х гг. наступіў уздым джазавага фестывальнага руху і выканальніцтва. Значны ўклад у развіццё джаза ў СССР і Расіі ўнеслі такія музыканты, як А. Лундстрэм, У. Людвікоўскі, Ю. Саульскі, А. Кальварскі, А. Казлоў, А. Крол.

Вытокі развіцця джазавай музыкі ў Беларусі звязаны з дзейнасцю Дзяржаўнага джаз-аркестра БССР, які быў утвораны 1 студзеня 1940 г. на чале з польскім трубачом Э. Рознерам. Пасля Вялікай Айчыннай вайны доўгія гады джазавая музыка ў Беларусі амаль не практыкавалася, але ўсё ж існавала ў аматарскім непрафесійным выканальніцтве. У 60-я гг. джазавую стылістыку магчыма было пачуць у творчасці Я. Грышмана, аркестра Б. Райскага і аркестра Мінскага дзяржаўнага цырка, аранжыроўках А. Шпянёва. У 1977 г. быў створаны Мінскі клуб аматараў джаза, тады ж узнік і калектыў, які выконвае традыцыйны джаз і дагэтуль – дыксіленд «Рэнесанс» [2]. У канцы 70-х гг. яскрава заявіў аб сабе джазавы фестывальны рух спачатку ў Віцебску (фестывалі джазавай музыкі «Віцебская восень», «Парад дыксілендаў» і існуючы зараз джаз-клуб у межах фестывалю «Славянскі базар у Віцебску»), потым з канца 80-х гг. у Мінску, дзе праводзіўся спецыялізаваны фестываль «Дні фартэпіяннага джаза», а таксама з пачатку 1990-х гг. – фестываль джазавай музыкі пад эгідай Дзяржаўнага канцэртнага аркестра пад кіраўніцтвам М. Фінберга. У межах аркестра працуюць біг-бэнд і розныя малыя саставы, якія спрыяюць творчым эксперыментам. Значную ролю ў развіцці джазавай музыкі на Беларусі адыгралі і адыгрываюць такія выканаўцы, як І. Сафонаў (саксафон), У. Ткачэнка (гіара, скрыпка), В. Шчарыца (труба), А. Бурштэйн, А. Плевіч, А. Эскін, С. Аляксандраў (фартэпіяна), Б. Бернштэйн (бас-гітара), Я. Уладзіміраў (трамбон) і з маладых выканаўцаў П. Аракелян (саксафон); вакальная група «Камерата»; калектывы «Яблычная гарбата» пад кіраўніцтвам І. Сацэвіча, «DTS-бэнд» пад кіраўніцтвам А. Каліноўскага.

Еўрапейскі джаз, у адрозненне ад амерыканскага, з'яўляецца прывітым да багатай еўрапейскай музычнай культуры, якая склалася і ўстаялася. Яго асаблівасцямі з'яўляюцца:

- новая выканальніцкая манера: джазмены змянілі «канцэртныя касцюмы», якія характэрны для акадэмічнага музычнага напрамку, на джынсы і пуловеры, аддаючы перавагу нефармальнаму становішчу нават у канцэртнай зале, што сімвалізавала роўнасць становішча;
- трапяткія адносіны да фальклору, асабліва ўласцівыя нацыянальным еўрапейскім школам джаза: шведскай (О. Свенсан), нарвежскай (Я. Гарбарэк), французскай (Р. Гальяна), эстонскай (У. Найсоо), літоўскай (П. Вяшняускас), расійскай (А. Кірэеў, Ю. Парфёнаў); у 70-х гадах гэты сплаў музычных традыцый атрымаў шырокае распаўсюджанне і набыў від новай стылявой плыні пад назвай этнаф'южн у межах больш буйнога стылю ф'южн;
- увядзенне новых тэмбраў: фальклорных інструментаў або нетрадыцыйных для джаза скрыпак і віяланчэлей, акардэонаў, басовых рагоў і г. д. (басовы альпійскі рог А. Шылкопера, губны гармонік Т. Тэлеманса);
- адыход ад экспрэсіўнай манеры выканання (у асноўным), цяга да пявучасці ў меласе, цякучасці ў разгортванні музычнага матэрыялу;
- дух эксперыментатарства і змяшэння як эстэтычных канцэпцый, так і стыляў – крэатыўнасць (трыо В. Ганэліна, О. Свенсана, гурты Жана Люка Панці, Рышара Гальяна, Мішэля Парталя); характэрна выкарыстанне стылявых і жанравых ідыём і прынцыпаў формы Новай і Найноўшай музыкі (акадэмічнай): алеаторыкі, санорыкі, серыйнай тэхнікі, атанікальнасці, электроннай музыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




Мал. 1. Эвалюцыя сучаснага еўрапейскага джаза

Адлюстраваць вышэйпералічанае можна на прыкладзе музычных твораў сучасных джазавых кампазітараў. У дзвюх фугах з цыкла «Джазавыя кантрапункты» Франк Петцальд (Германія), як вынікае з назвы твора, злучае класічную тэхніку імітацыйнай поліфаніі з прынцыпамі сучаснага еўрапейскага джаза: вялікай колькасцю храматызмаў, выкарыстаннем «свабоднага» дысананса, унутрытактавых і паміжтактавых сінкоп, полірытміі. У пачатку кожнай з п'ес аўтар прапісвае выкананне без асвінгавання меладычнай лініі [3, с. 22–24]. Прынцыпы акадэмічнай музыкі (форму) выкарыстоўвае ў сваім творы «Джазавая сюіта з трох п'ес: Інтрадукцыя і Танец, Раманс, Скерца» (прысвячэнне Чыку Карыа) Ігар Дадзіёмаў (Беларусь). Аўтар у дадзеным выпадку таксама злучае ў творы стылёвыя ідыёмы класічнага і сучаснага джаза.

Паколькі базавыя элементы сучаснага еўрапейскага джаза былі запазычаны з традыцыйнага і сучаснага амерыканскага джаза, каб глыбей зразумець спецыфіку еўрапейскага джаза, звернемся да гісторыі станаўлення і развіцця гэтага мастацтва ў ЗША. Джаз з'явіўся на поўдні ЗША ў XIX стагоддзі, іманентна ўвабраўшы ў сябе традыцыі як заходняй (у прыватнасці еўрапейскай), так і афрыканскай музычнай культур. Гэта праявілася ў злучэнні прынцыпаў еўрапейскай гармоніі і формы з афрыканскімі сродкамі выразнасці, такімі як метра-рытм, тэмбр і экмеліка. Галоўным прынцыпам джаза з'яўляецца імправізацыя, якая характарызуе кожную вусную народную творчасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




Мал. 2. Генезіс джаза

Ахарактарызуем афрыканскія прынцыпы музычнай выразнасці, якія сталі асноўнымі прынцыпамі джаза:

- панаванне музычнай выразнасці пры адноснай несамастойнасці тэксту;
- шматварыянтнасць кампазіцый (падобна вуснай народнай творчасці);
- імправізацыйнасць як прынцып развіцця мелодыі, рытму, гармоніі;
- рэспансорны прынцып, або прынцып лінейнага антыфону (імітуецца пераклічка галасоў або інструментаў ансамбля);
- мелодыка дэкламацыйнага, рэчытатыўнага характару, якая складаецца з паўтораў матываў; меладычнае развіццё варыяцыйнае;
- прыярытэтнасць гарызантальных меладычных ліній у шматгалоссі, якія пры спалучэнні адзін з адным у вертыкальным плане ствараюць эфект «бруднага» гучання – з пункта погляду правілаў гарманізацыі акордаў у класічнай акадэмічнай музыцы; адсюль – багацце дысанансаў; выкарыстанне танальнага прынцыпу гарманізацыі і блюзавага ладу (нізкія III і VII ступені мажорнага гукарада);
- багацце экмелікі і апраксімацыі – міжвольнага павышэння або паніжэння гукаў (дэтанацыя і вібрата на працяжных гуках), дабаўленне дадатковых арнаментальных нот і іншых меладычных упрыгожанняў (мелізматыка), слізгаценне ад адной ноты да другой, або свайго роду «падвыванне» (slide-notes), глісанда; мноства шумавых эфектаў – «хрыпуча-рыкаючая» манера інтанавання, так званая шаут- і граул-манеры;
- сінкапіраваная, так званая «рваная» рытміка, мноства кароткіх паўзаў; полірытмія; метрарытмічная канфліктнасць;
- спецыфічныя акордавыя ўтварэнні, такія як эліпсіс з сэптакордаў, большай часткай у кадансавых зваротах, або так званая «цырульніцкая гармонія», блок-акорды.

У працэсе эвалюцыі склаліся наступныя гістарычныя тыпы джаза: амерыканскі і еўрапейскі, традыцыйны і новы.

Традыцыйны джаз дзеліцца на архаічны і класічны. Архаічны джаз канчаткова сфарміраваўся ў 50–90-я гады XIX стагоддзя на тэрыторыі поўдня ЗША ў Новым Арлеане. Працэс яго фарміравання цесна звязаны з некаторымі сацыяльнымі ўмовамі, перш за ўсё з заканчэннем грамадзянскай вайны ў ЗША (1861–1865) і адменай рабства ў паўднёвых штатах (афраамерыканскае насельніцтва аказалася без сродкаў існавання, без працы, без прытулку ў сувязі з эканамічным крызісам); з урбанізацыяй афраамерыканскага насельніцтва (вялікая колькасць насельніцтва, якая займалася сельскай гаспадаркай, рынулася для заробку ў горад), мноствам «забаўляльных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

установ», разнастайнасцю нацыянальных традыцый і жанраў гарадскога мастацтва, а таксама вялікай запатрабаванасцю музыкантаў. Такім чынам, пераважна негрыцянскае насельніцтва і запоўніла гэтую нішу па прычыне прыроднай музыкальнасці і расавай дыскрымінацыі. Першыя джазавыя аркестры былі духавымі (пасля дэмабілізацыі і роспуску ваенных аркестраў у сувязі з заканчэннем ваенных дзеянняў, інструмент быў даступны нават для бедных слаёў насельніцтва). Яны прымалі ўдзел у святах, карнавалах, вулічных шэсцях і выконвалі адпаведны рэпертуар (маршы, рэгтаймы, папулярныя песенныя мелодыі, бытавыя танцы), у негрыцянскай сінкапіраванай манеры, у імправізацыйным духу. Захаваліся дакументальныя апісанні аркестраў «маршыруючага джаза» (marching band jazz, street jazz), якія прыведзены ў працах Ю. Панасье, Дж. Коліера, Л. Фезэра, М. Стэрнса, Б. Уланава, Н. Шапіра і Н. Хэнтафа, В. Конэн, В. Аўчыннікава і інш. Абазначым адметныя асаблівасці архаічнага джаза:

- спецыфіка ансамблевага выканальніцтва: падзяленне на дзве групы інструментаў: меладычную і рытмічную (у раннім класічным джазе інструментальны склад і іх функцыі былі не сталымі);
- выразная метрычная пульсацыя (beat), якая ажыццяўлялася чацвяртнымі працягласцямі на два ўдары ў кожным такце. Устойлівы метр ствараўся выканаўцам на трубе, трамбоне або любым іншым інтрументе нізкага рэгістра. Карнет (або іншы сярэднерэгістравы інструмент) іграў сінкапіраваную мелодыю, контрапунктам да басовай партыі, а таксама выканаўца на кларнеце дабаўляў да папярэдніх партый складаную вытанчаную меладычную лінію ў верхнім рэгістры, так званае аблігата (obbligato). Меладычная лінія, імправізацыйная па сутнасці, арганізоўвалася пры дапамозе даволі простага рытмічнага малюнка, у параўнанні з класічным джазам;
- апраксімацыя:

1) рытмічная – лёгкае адхіленне ад метрычнай пульсацыі, якая ствараецца шляхам папярэджвання метрычнай долі або як бы трапляючы выразна ў цэнтр пульсу, не падштурхоўваючы ўзяцце долі (атрымала назву «гарачага падыходу» або «гарачай манеры» выканання, а таксама hot jazz);

2) меладычная – вызначаецца рытмічным малюнкам у працэсе карэляцыі з рытмічнай нерэгламентаванасцю;

- своеасаблівая балансіроўка, «хістанне», так званы свінг, якая ствараецца комплексам сродкаў: акцэнтаваннем слабых другой і чацвёртай долей такта, так званы off beat, змяшчэннем лагічных акцэнтаў у фразіроўцы меладычнай лініі, адхіленнем ад метрычнай пульсацыі;
- полірытмія і крос-рытмічная канфігурацыя;
- астынатнасць меладычнай лініі (як правіла);
- гетэрафонны тып фактуры, які ствараецца выканаўцамі меладычнай групы інструментаў у працэсе выканання сумеснай імправізацыі;
- ударная, або перкусіўная манера гуказдабывання і насычаная (агрэсіўная) дынаміка гучання;
- спалучэнне класічнага еўрапейскага мажорнага і мінорнага ладоў і прынцыпу танальнай арганізацыі.

У адрозненне ад архаічнага джаза, класічны (ранні і позні) характарызуецца наступнымі параметрамі:

1) раздзяленне ансамбля інструментаў на дзве розныя па функцыях групы:

а) для ранняга класічнага джаза: першая група – інструменталісты, якія іграюць на карнеце (пазней на трубе), кларнеце і трамбоне, другая група – рытмсекцыя, якая складаецца з баса, фартэпіяна, банджо або гітары і ўдарных. Першая група стварае трохгалосны імправізаваны контрапункт або калектыўную імправізацыю шляхам правядзення трох меладычных ліній (сола), якія выконваюцца кларнетам, трамбонам і карнетам (трубой), з іх вядучая даручаецца карнету (трубе), ад якога контрапунктуе больш працяглымі нотамі партыя трамбона, а партыя кларнета ўзнаўляе арнаментальныя варыяцыі, якія называюцца аблігата; рытм-група, або рытм-секцыя, вытрымлівае асноўны рытм кампазіцыі і выконвае функцыю яе гарманічнага афармлення;

б) для позняга класічнага джаза: класічны для біг-бэнда набор інструментаў – чатыры трубы, пяць саксафонаў (два альты, два тэнары і барытон), чатыры трамбоны і рытм-секцыя, якая складаецца з фартэпіяна, гітары, баса і ўдарных; таксама замена калектыўнай імправізацыі серыяй сола, якая чаргуецца з аранжыраванымі эпізодамі tutti; выкарыстанне рыфавай тэхнікі –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асцінатнага паўтору меладычных мадэлей (рыфаў) для дынамічнага нагнятання ўнутранай метрарытмічнай канфліктнасці;

2) сінкапіраваная, так званая «рваная» рытміка, мноства кароткіх паўзаў, перавага поліритміі і метрарытмічная канфліктнасць: захаванне эфекту «балансіроўкі», «хістання», які называецца свінг і дасягаецца за кошт змяшчэння метрычных акцэнтаў; секвенцыі трох паслядоўных гукаў у межах чатырохдольнага такта (тып полірытмічнага налажэння «3» на «4», які з'яўляецца базісным у джазе); «апярэджваннем» (для ранняга класічнага джаза) і «спазненнем» (як адкрыццё позняга класічнага джаза, якое стварае рэлаксіўны эфект) часу метрычнай долі, перастаноўка лагічных (дынамічных акцэнтаў) у фразіроўцы, якія вызначаюць так званую «гарачую» манеру выканання;

3) наяўнасць своеасаблівай напружанасці, куражу, якая называецца драйвам, і асабліва экспрэсіўнай манеры выканання, выяўленай у агрэсіўным спосабе гуказдабывання і моцнай дынаміке гука;

4) арганізацыя структуры кампазіцыі:

а) імправізацыйнасць як прынцып развіцця мелодыі, гармоніі, рытму;

б) захаванне рэспансорнага прынцыпу архаічнага джаза (у познім класічным джазе перанос гэтага прынцыпу на секцыйныя групы – саксафоны, трубы і трамбоны – вялікага джазавага аркестра);

в) формы: песенная форма AABA (32-тактавая рэпрызная), песенная форма (простая), якая складаецца з 2 сказаў, або з кантрастным эпізодам і рэпрызай (з 3 частак); састаўная форма AAB бар, або так званы блюзавы квадрат (12 тактаў); квадратнасць як прынцып арганізацыі структуры кампазіцыі;

г) тэктоніка: прыярытэт кратных размераў – двухдольнасць для ранняга класічнага і чатырохдольнасць для позняга класічнага джаза, квадратнасць структуры;

д) гармонія: як правіла, выкарыстанне мажору і мінору, блюзавага ладу (глядзі вышэй), танальны прынцып гарманізацыі;

е) акордыка: канструкцыя акордаў, па вызначэнню Ю. Халопава, прадстаўлена ў выглядзе недвухсэнсоўна функцыянальнага субакорда з пабочнымі тонамі, рэдка ў выглядзе поліакорда, перавага сугучнасцей з моцна і адназначна выяўленым асноўным тонам, цяга да сэптакордаў, выкарыстанне нон-, дэцым- і ундэцымакордаў разам з трохгучнасцямі, секст- і квартсэкстакордамі, выкарыстанне акордаў без асноўнага тону, з прапушчанай тэрцыяй або квінтай, секвенцый, эліпсісаў («цырульніцкая гармонія»), блок-акордаў.

У якасці ілюстрацыі возьмем твор Д. Элінгтона «In a sentimental mood» [4, с. 98], напісаны ў жанры джазавай балады ў форме AABA (36 тактаў). У частцы «B» адбываецца варыяцыйнае развіццё на астынатную гарманічную паслядоўнасць D → Des, D → Es на працягу 6 тактаў (гарманічны рыф), што садзейнічае вуаліраванню асноўнай (F-dur) танальнасці, як у акадэмічнай музыцы – схаваная, «лунаючая» танальнасць у творчасці Вагнера, Вольфа і Шэнберга.

Сучасны джаз характарызуецца наступнымі параметрамі:

- цяга да канцэртнасці, калі джаз з'яўляецца музыкай для слыхавога ўспрымання;
- павелічэнне ролі сольнай імправізацыі, выверанасць яе структуры, а таксама навізна матэрыялу;
- з'яўленне новага прынцыпу пабудовы імправізацыі – лінеарнага (стварэнне новай меладычнай лініі), разам з выкарыстаннем традыцыйнага прынцыпу – парафразіравання (абыгрыванне існуючай меладычнай лініі);
- прыярытэтнасць камерных (малых) саставаў, так званых комбо (5–7 выканаўцаў); біг-бэнды захавалі сваё існаванне, аднак іх стала значна менш;
- ускладненне кампазіцыйных тэм па зместу (адыход ад лёгкажанравасці, захапленне ўсходняй філасофіяй);
- тэхнічнасць і віртуознасць выканаўцаў;
- ускладненне музычнай мовы:

1) меладычная лінія падаўжаецца, ускладняецца, знікае перарыўнасць, якая ствараецца ў традыцыйным джазе праз распрацоўку матыву і мноствам кароткіх паўзаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2) узмацняецца спалучэнне песеннасці, дэкламацыйнасці і рэчытатыўнасці;

3) лад: разам з мажора-мінорам і «блюзавым» ладам выкарыстоўваюцца лады старажытнагрэчаскай музыкі, у прыватнасці лідзійскай, фрыгійскай і інш.;

4) гармонія: выкарыстоўваюцца прынцыпы некласічнай еўрапейскай гармоніі – алеаторыка, санорыка, атанікальнасць, дадэкафонны прынцып арганізацыі музычнага матэрыялу; «блюзавы» лад трансфарміруецца шляхам ускладнення гарманічнай сеткі, праз шырокае дабаўленне пабочных ступеней ладу і акордаў на іх, адхіленняў і мадуляцый у танальнасці далёкай ступені блізкасці, а таксама ўвядзенні нізкай 5 ступені і секвенцый (храматычных); адбываюцца змены ў акордыцы: шырока выкарыстоўваюцца альтэрацыі і пропуск гукаў у сэптакордах, нон-, дэцым-, ундэцым-, тэрцдэцымакордах усіх асноўных ступеней ладу, выкарыстоўваюцца акорды з дабаўленымі тонамі, квартакорды і храматычныя кластэры – гучанне набывае характар (жорстка) рэзкадысанаснага.

Такім чынам, еўрапейскі сучасны джаз уяўляе сабой унікальны феномен сусветнай музычнай культуры, які бярэ пачатак у традыцыйным і сучасным амерыканскім джазе. У працэсе сваёй эвалюцыі ён увабраў у сабе элементы як амерыканскага джаза, так і нацыянальны фальклор і ідыяматыку авангарднага музычнага мастацтва акадэмічнай традыцыі. Дзякуючы гэтаму сфера ўплыву джазавага мастацтва на сусветную музычную культуру значна пашыралася і ахапіла творчасць кампазітараў розных стылявых напрамкаў, творчых школ і кірункаў. Працэсы крос-стылявой канвергенцыі спадарожнічаюць эвалюцыйнаму руху еўрапейскага джаза, і на сучасным этапе існуе тэндэнцыя перарастання кантынентальных джазавых музычных традыцый у адзіны сусветны джаз, які аб'ядноўвае ў сабе розныя нацыянальныя культуры.

## Літаратура

1. К а з у р о в а, А. С. Джаз в творчестве зарубежных композиторов первой половины XX века : учеб. пособие [для муз. вузов] по курсу «Современная музыка» / А. С. Казурова. – М. : МГИМ, 1998. – 72 с.

2. Музычны слоўнік беларуска-рускі. = Музыкальный словарь русско-белорусский / [аўт.-склад. : Г. Р. Куляшова, Т. Г. Мдывані, Н. А. Юўчанка і інш. ; навук. рэд. : Г. Р. Куляшова, Л. А. Антанюк]. – Мн. : Бел. навука, 1999. – 559 с. : нот. іл. (с. 70–71).

3. Джазовые и эстрадные композиции для фортепиано [Ноты]. Вып. 8 / [сост. В. Ерохин]. – М. : Музыка, 1989. – 64 с.

4. Джазовая мозаика : [сб. / сост. Ю. Чугунов]. – М. : ЗАО «Рифмэ», 1997. – 132 с.

*I. A. RABUSHKINA*

**THE MODERN EUROPEAN JAZZ (STRUCTURE AND CLASSIFICATION)**

## Summary

The article deals with the history of the penetration, development and evolution of the modern European jazz and offers a description of its main parameters and means of musical expression. The author analyzes forms of the cross-style convergence process in the West European, North American, Russian and Belarusian musical art of jazz on the example of works. On the basis of presented materials the distinctive features of the modern European jazz, ways of its further evolution and the peculiarities of the cross-style convergence phenomenon in the world musical culture have been revealed.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ